# ВЫКАРЫСТАННЕ ТРАДЫЦЫЙ НАРОДНАЙ ПЕДАГОГІКІ Ў ВЫХАВАННІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ШКОЛЬНІКАЎ

*Л. Я. Васіленя, М. А. Шатарава*
*БДПУ (Беларусь)*

У артыкуле разглядаюцца значэнне і педагагічныя магчымасці выкарыстання традыцый народнай педагогікі ў выхаванні нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў.

*Ключавыя словы*: нацыянальная самасвядомасць, традыцыйная культура, народная педагогіка, традыцыі і звычаі, фальклорны твор.

Выхаваўчая работа ў школе дае вялікую магчымасць для творчага выкарыстання народных педагагічных традыцый. Адна з важнейшых умоў выхавання нацыянальнай самасвядомасці – далучэнне вучняў да нацыянальных традыцый свайго народа сродкамі беларускай народнай педагогікі, у аснове якой апора на родную мову, традыцыйна-бытавую культуру і агульначалавечыя каштоўнасці. У сучасным свеце педагагічная думка ўсё часцей звяртаецца да досведу этнапедагогікі, якая ўтрымлівае ў сабе велізарны творчы патэнцыял. Па-за сумнення, важнай задачай сучаснай адукацыі з'яўляецца не толькі перадача ведаў і фарміраванне ўменняў і навыкаў у вучняў, але і выхаванне «чалавека культуры», здольнага да мірнага суіснавання, кантакту, зносінаў і супрацоўніцтва з прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцяў.

Вывучэнне і даследаванне нацыянальных традыцый і звычаяў, твораў народнага мастацтва, стварэнне моўнага асяроддзя і пашырэнне выкарыстання элементаў традыцыйнай культуры ў навучанні дапамагае асобе адчуць сваю еднасць з прадстаўнікамі пэўнай этнасацыяльнай супольнасці, у значнай ступені садзейнічае фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці асобы. Выкарыстанне фальклору – адна з галоўных умоў фарміравання высокага ўзроўню нацыянальнай самасвядомасці школьнікаў.

У народнай педагогіцы сфарміраваўся шэраг сродкаў і метадаў выхавання. Да іх адносяцца ўсе віды народнай творчасці, з дапамогай якіх аказваецца выхаваўчае ўздзеянне на дзяцей, гэта значыць вусная народная творчасць, розныя віды працоўнай дзейнасці, народная харэаграфія, гульні, рамёствы, святы, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і г. д.

Сярод асноўных сродкаў народнай педагогікі можна выдзеліць працу. Заняткі разнастайнымі відамі дзейнасці сфарміравалі пэўны тып характару, важнейшыя маральныя якасці беларуса. У працэсе працоўнай дзейнасці засвойваецца народная праграма выхавання. У яе складзе фізічнае развіццё, бо выкананне працоўных аперацый патрабуе авалодання пэўным наборам уменняў і навыкаў, своеасаблівай азбукі фізічных намаганняў; разумовае выхаванне – набыццё пэўнай сумы ведаў, што забяспечвае правільнае і майстэрскае валоданне дадзеным відам працы; эстэтычнае выхаванне – любы від працы самага ўтылітарнага прызначэння, а тым больш той, што прадугледжвае творчасць (напрыклад, выраб уласнымі рукамі матэрыяльных каштоўнасцей), выяўляе эстэтычнае ўспрыманне свету і садзейнічае эстэтызацыі асобы. Праца з'яўляецца важным сродкам духоўна-маральнага выхавання, падручнікам маралі, а працавітасць – крытэрый маральнай ацэнкі асобы. У працоўнай дзейнасці фарміруюцца арганізаванасць, сціпласць, павага да людзей, упартасць і іншыя маральныя якасці.

Важны сродак і метад народнай педагогікі – гульня. Задавальняючы натуральнае імкненне дзіцяці да актыўнай дзейнасці, яна дазваляе ў цікавай форме далучыць да маральных ідэалаў, дае ўяўленне аб навакольнай рэчаіснасці, вучыць узаемаадносінам з прыродай і людзьмі, дае прасцейшыя веды, уменні і навыкі ў розных відах дзейнасці, развівае разумова, фізічна і эстэтычна. У народных гульнях, як правіла, знаходзіць сваё адлюстраванне культура народа, яго светапогляд, традыцыі, звычаі, вусная народная творчасць.

На працягу стагоддзяў выпрацаваліся пэўныя адносіны, сваё ўяўленне пра дабро і зло, свае маральныя прынцыпы, у якіх адбіваюцца сацыяльна-гістарычныя патрабаванні да чалавека, свой погляд на правілы і нормы паводзін. Этычныя праблемы народнай педагогікі знайшлі адлюстраванне і ў вуснай народнай творчасці.

У народнай педагогіцы знайшлі адлюстраванне таксама і праблемы маральнага выхавання чалавека, дзе вызначаны дзве важнейшыя асновы – сумленне і грамадская думка. Яны з'яўляюцца спецыфічнымі спосабамі рэгулявання і карэкціроўкі паводзін асобы, фарміруюць нормы і правілы народнай маралі. Аб імкненні беларускага народа рэгуляваць свае паводзіны і ўчынкі з пазіцыі народнага ўяўлення пра дабро і зло, аб веры ў перамогу дабра над злом распавядаюць шматлікія прыказкі і прымаўкі.

Глыбокі выхаваўчы патэнцыял заключаны ў народнай харэаграфіі. Традыцыі народнага танца перадаваліся з пакалення ў пакаленне, захоўваючы нормы паводзін пры зносінах, традыцыйныя святочныя каноны, маральныя правілы і ўзоры. Танец адлюстроўвае аб'ектыўную рэчаіснасць, якая выяўляецца ва ўмоўнай форме пры дапамозе галоўнага выразнага сродку – пластыкі чалавечага цела. У харэаграфічным мастацтве прыгажосць формы непарыўна звязана з прыгажосцю ўнутранага зместу танца, яго глыбокім

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сэнсам, у якім заключана сіла яго выхаваўчага ўздзеяння. Народны танец не толькі ра павядае пра рэальныя з'явы, паказвае прадметы, але і адлюстроўвае ўнутраны свет чал века, яго думкі, эмацыянальны стан, настрой, пачуцці. Пры гэтым нацыянальны хара тар танца выяўляецца ў яго харэаграфічнай і музычнай структуры, выканаўчай манер каларытных асаблівасцях. Народная харэаграфія мае вялікае значэнне для фізічнага ра віцця, садзейнічае фарміраванню добрай выправы фігуры, аказвае ўплыў на выхаван ўнутранай культуры чалавека, звязанай з выпрацоўкай камунікаўных уменняў, з засв еннем норм народнай этыкі (сціпласць, ветлівасць, увага да людзей, дабразычлівасц з фарміраваннем валявых рыс характару чалавека.

У народных песнях і казках нярэдка стаіць праблема маральнага выбару. І народн герой вырашае гэту праблему з пазіцыі дабра. Ён з павагай адносіцца да старэйшы прыходзіць на дапамогу, вядзе барацьбу са злом, вызваляе людзей ад злых сіл, вярт незалежнасць, шчасце, сонца, ваду, выратоўвае жывёл і абавязкова атрымлівае сва ўзнагароду за добрыя ўчынкі. Такім чынам сцвярджаецца высокамаральная аснова да рыні. У фальклорных творах зафіксавана асноўнае правіла жыццёвай мудрасці, яно з'я ляецца народным запаветам, прадпісаннем дзейнічаць у адпаведнасці з тымі патрабава нямі, якія індывід прад'яўляе да іншых. Мэта гэтага патрабавання – улічваць інтарэс ўсіх. Гэта правіла маральнасці фарміруе ідэю гуманізму, павагі павагі павагі... 

Вызначаючы задачы і асноўны змест выхавання на народных педагагічных трад цыях, неабходна зыходзіць з таго, што ў фарміраванні сучаснага чалавека мэтазгод выкарыстоўваць усё лепшае, прагрэсіўнае, што ёсць у багацейшым арсенале народна педагогікі, якая складвалася і апрабоўвалася на працягу многіх стагоддзяў.


**Літаратура**

1. Воронецкая, Л. Н. Народная педагогика / Л. Н. Воронецкая, М. Ю. Мелешко. – Минск : Красик принт, 2007. – 176 с.
2. Этнопедагогика: история и современность : материалы Междунар. науч.-практ. конф., Мозыр 17–18 окт. 2013 г. / УО МГПУ им. И. П. Шамякина ; редкол.: В. С. Болбас [и др.]. – Мозыр 2013. – 295 с.




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ